УДК 316.42:316.64

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ Ў КУЛЬТУРЫ СОЦЫУМУ

***В. М. Белакурскі,*** *кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

***Ж. Я. Белакурская,*** *кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца пытанні генезісу і развіцця нацыянальнай ідэі з антычнага часу да нашых дзён. Засяроджваецца ўвага на своеасаблівасцях падыходаў да асэнсавання і вырашэння дадзенай праблемы на Захадзе і Усходзе. Супастаўляюцца паняцці заходняга лібералізму, рускай ідэі, кітайскага традыцыяналізму, беларускай ідэі. Адзначаецца, што ліберальная ідэалогія заходняга тыпу прывяла да фарміравання прынцыпаў грамадзянскага соцыуму. Аўтарамі рускай ідэі ўвага акцэнтавалася на цывілізацыйна-культурнай самабытнасці рускага народа. Кітай здзейсніў свой эканамічны рывок, абапіраючыся на канфуцыянскую традыцыю. Лейтматывам беларускай нацыянальнай ідэі павінна стаць глыбокае ўсведамленне адзінства нашай краіны як сацыяльнага цэлага, сацыяльнага арганізму. У сваіх асноўных прынцыпах яна павінна стаць платформай практычнай дзейнасці ўсіх грамадзянскіх і дзяржаўных органаў.

**Ключавыя словы:** народ, нацыя, соцыум, ідэнтычнасць, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальная культура, ідэя, нацыянальная ідэя, Захад, ліберальная ідэя, Расія, руская ідэя, Кітай, традыцыя Кітая, Беларусь, беларуская ідэя.

# NATIONAL IDEA IN THE CULTURE OF SOCIETY

***V. Belakurski,*** *PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social Sciences and Humanities of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

***Z. Belakurskaya,*** *PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Intercultural Communications of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Abstract.** The article examines the genesis and development of the national idea from ancient times to the present day. The focus is on the peculiarities of approaches to understanding and solving this problem in the West and East. The concepts of Western liberalism, Russian idea, Chinese traditionalism, Belarusian idea are compared. It is noted that the liberal ideology of the Western type has led to the formation of the principles of civil society. The authors of the Russian idea focused on the civilizational and cultural identity of the Russian people. China has made its economic leap based on Confucian tradition. The leitmotif of the Belarusian national idea should be a deep awareness of the unity of our country as a social whole, a social organism. In its basic principles, it should become a platform for the practical activities of all civil and state bodies.

**Keywords:** people, nation, society, identity, national identity, national culture, idea, national idea, West, liberal idea, Russia, Russian idea, China, Chinese tradition, Belarus, Belarusian idea.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Генезіс паняцця «нацыянальная ідэя» звязаны з антычнай філасофскай думкай. Платон лічыў, што менавіта ідэі з'яўляюцца тымі ўзорамі, дзякуючы якім з неаформленай матэрыі ўзнікаюць рэальныя прадметы і рэчы. Пазней, у часы Сярэднявечча, канцэпцыя Платона набыла сацыяльна-палітычны змест. Так, у тэакратычнай дактрыне А. Аўгусціна «ідэя» становіцца неабходным паняццем пры абгрунтаванні асноў свецкай дзяржавы – «града зямнога». У XVII–XVIII стст. у працах Т. Гобса, Дж. Лока, Ж.-Ж. Русо тэалагічны аспект ідэі быў заменены тэорыяй дамоўнай дзяржавы. Тым самым паступова закладваліся тэарэтычныя асновы фарміравання заходняй мадэлі «нацыянальнай» ідэі, якую пераважна пачыналі суадносіць з ідэяй дзяржаўнасці. Пазней у нямецкай класічнай філасофіі, дзякуючы працам І. Г. Гердэра, В. Гумбальдта, І. Г. Фіхтэ, Г. В. Ф. Гегеля, былі сфармуляваны новыя паняцці, якія ў далейшым сталі больш цесна звязвацца з нацыянальнай ідэяй: менталітэт, уплыў моўных і прыродна-геаграфічных фактараў на фарміраванне спецыфічных рыс нацыянальнага характару і інш. Закладваліся палітыка-прававыя аспекты нацыянальнай ідэі, абгрунтоўваўся прыярытэт індывідуалізму, свабоды, раўнапраўя. Такім чынам, нацыянальная ідэя канцэптуальна афармлялася ў ліберальную ідэалогію заходняга грамадства, з дапамогай якой у Еўропе і ЗША усталёўваліся прынцыпы фарміравання т. зв. грамадзянскага соцыуму.

Асобнай увагі заслугоўвае распрацоўка альтэрнатывы заходняга праекта рускімі мысліцелямі XIX ст. (А. С. Хамякоў, І. В. Кірэеўскі, М. Я. Данілеўскі, Ф. М. Дастаеўскі, У. С. Салаўёў і інш.). Яе асноўныя палажэнні быді звязаны з комплексам праблем, акцэнтуючых увагу менавіта на цывілізацыйна-культурнай самабытнасці рускага народа. Руская нацыянальная ідэя выразна акрэслівалася такімі паняццямі, як саборнасць, усеадзінства, сацыяльная справядлівасць, прыярытэт духоўных і мараль-

ных каштоўнасцей па-над матэрыяльнымі (несцяжальніцтва), эсхаталагічнасць. Вылучаючы апошняе, У. С. Салаўёў пісаў: «Ідэя нацыі ёсць не тое, што яна думае аб сабе ў часе, а тое, што Бог думае аб ёй у вечнасці» [3, с. 187]. Гэта сведчыць аб перакананні аўтара, што нацыянальная ідэя павінна быць накіравана ў будучыню, паколькі выступае яе своеасаблівым праектам. Больш таго, яна існуе менавіта дзеля таго, каб весці народ наперад.

Думка аб тым, што беларусы з'яўляюцца асобным народам або нацыяй, выразна заявіла аб сабе ў друкаваным выглядзе толькі ў 1884 г. у часопісе «Гоман» [2, с. 60–71]. Адзначым таксама, што ў другой палове 80-х гг. XIX ст. у Мінску ўзнікла група ліберальнай інтэлігенцыі (М. Доўнар-Запольскі, В. Завітневіч, А. Слупскі, Я. Лучына), якая імкнулася абудзіць нацыянальную самасвядомасць беларуса. Пасля адмены забароны царскімі ўладамі на беларускамоўныя выданні (1905 г.) і ўзнікнення беларускіх выдавецтваў, сярод якіх галоўную ролю адыграла «Наша ніва», наперад выступіла магутнае згуртаванне будучых беларускіх пісьменнікаў-класікаў, буйных грамадска-палітычных і культурных дзеячаў. Сапраўднымі выразнікамі беларускай нацыянальнай ідэі і інтарэсаў абуджанага беларускага грамадства сталі Я. Купала, Я. Колас, А. Пашкевіч (Цётка), М. Багдановіч, А. Гарун, браты А. і І. Луцкевічы, Я. Карскі, У. Ластоўскі, Я. Лёсік, У. Галубок, Я. Драздовіч і інш. Напрыклад, у М. Багдановіча праблему нацыянальнай ідэі даволі выразна адлюстроўвалі такія публіцыстычныя творы, як «Хто мы такія?», «Беларускае адраджэнне», «Новая інтэлігенцыя» і інш.

Задача фарміравання нацыянальнай ідэі займала галоўнае месца ў творы І. Абдзіраловіча «Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага светапогляду». Палажэнні працы вызначаліся не толькі надзвычай востраю актуальнасцю, але і неслі канцэптуальны характар. Аўтар аргументавана абгрунтаваў неабходнасць пошуку сапраўды нацыянальных формаў жыцця, якія б маглі трывала супрацьстаяць замежнаму месіянству. Паводле Абдзіраловіча, кожная з такіх формаў не прыходзіць звонку, а паўстае вынікам працяглага развіцця народа і яго культуры. Паколькі ж беларускі народ на працягу доўтага гістарычнага часу быў пазбаўлены магчымасці быць суб'ектам свайго гістарычнага лёсу, ён павінен ім нарэшце стаць, ідучы шляхам самастойнай грамадска-культурнай дзейнасці. Абдзіраловіч настойліва падкрэсліваў, што «галоўнае жаданне чалавека – гэта жаданне быць вольным, быць тварцом свайго жыцця» [1, с. 42].

Адзначым, што намаганні самай крэатыўнай і адказнай часткі беларускай інтэлігенцыі ў дадзеным напрамку так і не былі рэалізаваны, паколькі ў далейшым іх ў жорсткай форме перакрэсліў вульгарна-класавы падыход да нацыянальнай культуры, які навязваўся партыйнымі ўладамі, а сама яна была амаль цалкам знішчана сталінскімі рэпрэсіямі. У выніку нацыянальная ідэя на доўгі час была выкарчавана з глыбінь свядомасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларуса, на яе ж месца прыйша ідэя пралетарскага інтэрнацыяналізму, а пазней – ідэя пабудовы камуністычнага грамадства.

Глабалізацыйныя працэсы, якія працякаюць у сучасным свеце, нясуць пагрозу нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці народаў, паслабляючы і разбураючы гістарычна сфарміраваныя традыцыі. Менавіта таму сучаснае грамадства адчувае настойлівую патрэбу вызначэння і захавання сваёй самабытнасці і ўнікальнасці на нацыянальна-дзяржаўным узроўні. У гэтых умовах асобную ролю набывае канкрэтнае асэнсаванне грамадствам зместу нацыянальных каштоўнасцей, а таксама выяўленне іх творчага патэнцыялу. Адной з найважнейшых па-ранейшаму выступае нацыянальная ідэя, якая ўвасабляе субстанцыйна-метафізічныя, сацыякультурныя і гісторыясофскія вытокі сэнсаў існавання дадзенай нацыі.

У 1990-я гг. у выніку адмены жорсткіх установак камуністычнай ідэалогіі на постсавецкай прасторы індывід аказаўся вызваленым не толькі ад каштоўнасцей нацыянальных традыцый, але і ад абавязкаў перад сваёй краінай і народам. Механізмы забеспячэння захавання гістарычнай памяці перасталі аднаўляцца, працэс культурнай ідэнтыфікацыі ўсё часцей набываў стыхійны характар. Страчвалі сваю вядучую ролю ў сацыялізацыі розных слаёў і асабліва моладзі традыцыйныя інстытуты: сямейны, прафесійны, канфесійны і інш. Гэта вяло да тэктанічнага зруху ў соцыуме ад грамадства працаўніка да грамадства спажыўца з адпаведным зніжэннем прэстыжу і значэння працы ў жыцці чалавека. На прыкладзе краін постсавецкай прасторы добра бачна, што ўсе ранейшыя т. зв. перабудовы і постперабудоўныя рэформы былі заснаваны на чужых штучных узорах, якія не нараджаліся натуральным чынам з глыбінь нацыянальных культур, а былі прынесены звонку Захадам. Таму сённяшняму чалавеку прыходзіцца канстатаваць іх неадпаведнасць аптымістычным надзеям і чаканням.

Нагадаем у дадзенай сувязі, што, рэфармуючы эканоміку і звяртаючыся да нацыянальных каранёў пасля знікнення мааісцкага рэжыму, Кітай засяроджваў увагу грамадства на каштоўнасцях вучэння Канфуцыя, асабліва канфуцыянскай этыкі, якая ў краіне стала своеасаблівым стрыжнем нацыянальнай ідэі. Менавіта з гэтай нагоды ў КНР настойліва праводзіўся і пашыраўся прынцып «Бараніць старога, турбавацца аб дзіцяці». Сучасны Кітай прадстае перад міжнародным супольніцтвам адзінай нацыяй, якая не прымае «мысленне без радзімы», а нацыянальна арыентаваныя сацыяльна-гуманітарныя навукі абараняюць у кітайскім грамадстве тыя ідэі, якія з прыхільнасцю прымаюцца большасцю грамадзян. У нашы дні старажытная кітайская прымаўка «Адзіныя, але не тоесныя» служыць усім яскравым напамінам, што розныя палітычныя спрэчкі не павінны весці да дэструктыўных парушэнняў соцыуму.

Праблема фарміравання нацыянальнай ідэі не можа быць вырашана па-за ўсебаковым асэнсаваннем усіх тых гістарычных выклікаў, якія сён-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня зроблены Беларусі і яе народу. Лейтматывам нацыянальнай ідэі, на наш погляд, павінна стаць глыбокае ўсведамленне адзінства нашай краіны як сацыяльнага цэлага, як своеасаблівага сацыяльнага арганізму. Дзеля гэтага сама нацыянальная ідэя павінна быць цэласнай, г. зн. гармонічна ўтрымліваць у сабе базавыя каштоўнасці асобавай, грамадскай і дзяржаўнай існасці. Забяспечваючы асновы згоды ў грамадстве і акрэсліваючы перспектывы яго развіцця, такая ідэя павінна мець зразумелую стратэгію і адпаведныя механізмы яе ўвасаблення. У сваіх асноўных прынцыпах яна можа стаць своеасаблівай каардынацыйнай платформай практычнай дзейнасці ўсіх органаў улады нашай дзяржавы.

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага светапогляду / І. Абдзіраловіч. – Менск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. Публицистика белорусских народников / сост., подгот. текстов С. Х. Александровича и И. С. Александрович. – Минск : БГУ, 1983. – 134 с.

3. *Соловьев, В. С.* Русская идея / В. С. Соловьев // Сочинения / В. С. Соловьев. – М. : Республика, 1992. – С. 185–205.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 004.9:[008+7]+316.4

# УНИКАЛЬНАЯ ЦИФРОВАЯ ТЕХНОЛОГИЯ КАК ИНСТРУМЕНТ ПРОДВИЖЕНИЯ ПРОИЗВЕДЕНИЙ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВА

***Н. В. Борисова,*** *кандидат социологических наук,*
*доцент кафедры туризма федерального государственного*
*бюджетного образовательного учреждения высшего образования*
*«Казанский государственный институт культуры», г. Казань*

**Аннотация.** В условиях цифровой трансформации мирового сообщества зарождается новая тенденция современного криптоискусства, представляющего собой позиционирование, сохранение и продвижение цифровой культуры и искусства, подлинность которого может быть подтверждена путем использования NFT-технологии (невзаимозаменяемого токена). В настоящее время сохранение и воспроизведение произведений культуры становится возможным на различных цифровых платформах. Технология блокчейн позволяет отслеживать воспроизведение и создание версий художественного произведения, что до сих пор было затруднительно сделать с точностью. В статье рассмотрены инструменты использования NFT-технологии в российской и зарубежной культурной практике, которая открывает новые возможности для популяризации неизвестных авторов и произведений и поддержания имиджа известных организаций в сфере